# Кантрольная тэставая работа
# Варыянт 1

**1.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць ***апостраф***:

1) з_ядналы;
2) міл_ярд;
3) сям_я;
4) шмат_ярусны;
5) пасляслоў_е.

**2.** Адзначце правільна напісаныя словы (формы слоў):

1) разводдзе;
2) рэжыссѐр;
3) падарожжа;
4) моладзью;
5) спатканне.

**3.** Адзначце словы (формы слоў), у якіх на месцы пропуску трэба пісаць **літару *с*:**

1) _чодры;
2) ра_чырванецца;
3) пагру_чык;
4) про_ьба;
5) мые_ся.

**4.** Адзначце словы, у якіх выдзелены ***суфікс***:

1) таблет***ка***;
2) ліфц***ѐр***;
3) баян***іст***;
4) па-сапраўдн***аму***;
5) наіў***н***ы.

**5.** Адзначце словы, якія трэба пісаць праз злучок:

1) (паў) Магілѐва;
2) (леса) нарыхтоўка;
3) (літ) работнік;
4) (Давыд) Гарадок;
5) інжынер (праграміст).

6. Адзначце словы, у яких на месцы пропуску пішацца **літара а:**

1. р_цэпт; 2. ар_хі; 3. п_чырк; 4. шніц_ль; 5. характ_рыстыка.

**7.** Адзначце словы, у яких на месцы пропуску пішацца **літара я:**
1. св_ткаваць; 2. персп_ктыва; 3. выв_трыць; 4. вогн_трывальны; 5. с_мейны.

**8.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца **літара *ў*:**

1) на ..збярэжжы;
2) шлагба..м;
3) па..ночны;
4) прыехалі да ..сціна;
5) паўднёва - ..сходні.

**9.** Адзначце словы, утвораныя **бяссуфіксным спосабам:**

1. Стогн
2. Падкоп.
3. Падсвечнік.
4) Маладосць.
5) Моладзь

**10.** Адзначце **рэчыўныя назоўнікі**:

1. анальгін;
2. хвароба;
3. сталь;
4. мука';
5. калоссе.

**11.** Адзнаце прыклады, у якіх не, ні з выдзеленымі словамі трэба пісаць **асобна:**

1) **(не) развітваючыся;**
2) куды **(ні) паглядзі;**
3) **(не) пасалоджаная** кава;
4) правілы **(не) парушаны;**
5) **(ні) якая.**

**12. Адзначце словы, у якіх пішацца літара Ы:**

1) бр...зент;
2) ч...мпіён;
3) інж...нер;
4) д...макратыя;
5) ц...мент.

**13.** Адзначце выпадкі, калі пры ўтварэнні патрэбнай формы назоўніка адбываецца **чаргаванне:**

1) без (жаль);
2) вісець на (дрот);
3) тэлефанаваць (сястра);
4) паром на (рака);
5) паварот на (дарога).

**14. Адзначце словы, у якіх прапушчаны літары:**

1) шас...наццаць;
2) помс...лівы;
3) ландшаф...ны;
4) рас...еяны;
5) сэр...ца.

**15. Адзначце назоўнікі, ад якіх утвараюцца прыналежныя прыметнікі з суфіксамі** *–ін-(-ын-):*

1. брат;
2. каваль;
3. Коля;
4. дачка;
5. Тоня.

**16. Адзначце састаўныя лічэбнікі:**

**1.** чатырыста;
**2.** пяцёра;
**3.** восемдзесят;
**4.** адна трэцяя;
**5.** дваццаць адзін.

**17. Адзначце нязменныя формы дзеясловаў:**

1. паклапаціўшыся;
2. скошаны (луг);
3. канспектаваў;
4. сагрэеш;
5. зімаваць.

**18.** Утварыце ад колькаснага лічэбніка ***тры*** парадкавы. Парадкавы лічэбнік запішыце ў форме роднага склону адзіночнага ліку.

**19**. Да назоўніка ***фальш*** дапасуйце прыметнік ***яўны.*** Словазлучэнне запішыце ў форме роднага склону.

**20.** Запішыце, якой часцінай мовы з'яўляецца выдзеленае слова:

***Напярэдадні*** *Раства сям'я збіралася па перадкалядную вячэру — яна называлася ў народзе куццёю.*

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | |
| | | | | | | | | | |